Акрамя таго, выкарыстоўваючы лексіку з урыўка фільма, можа ўзнікнуць спантанна практыкаванне або спатрэбіцца ўвод пэўных моўных структур, напрыклад выказаць меркаванне, апісаць дзеючых асоб, іх дзейнасць і інш.

Сцэны, прыгодныя для такіх практыкаванняў, выкладчык знойдзе ў любым фільме.

Такім чынам, выкарыстанне відэа з'яўляецца крэатыўным відам работы не толькі для студэнтаў, але і для выкладчыка.

Безумоўна, не існуе універсальнага рэцэпта для работы з відэафільмам. Можна толькі прапанаваць пэўныя прыёмы, якімі выкладчык карыстаецца і якія для групы студэнтаў з'яўляюцца найбольш цікавымі.

Прагляд кожнага фільма патрабуе абгрунтаваных абагульненняў. Заключнае абмеркаванне павінна змяшчаць не толькі суджэнне (станоўчае ці адмоўнае), але і прапановы (як можна было б дзейнічаць інакш), выкарыстоўваючы знаёмы вакабуляр.

Такім чынам, вопыт выкарыстання вучэбнага відэафільма, як і іншых сродкаў масавай інфармацыі, сведчыць аб станоўчым уплыве іх на развіццё камунікатыўных здольнасцей студэнтаў і стымуляцыю іх інтарэсу да авалодання на замежнай мове.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Р.Ф.Шаура,** *прафесар*
**В.М.Ушакова,** *дацэнт*

## САЦЫЯЛЬНА-ГУМАНІТАРНЫ АСПЕКТ ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ ПА СПЕЦЫЯЛІЗАЦЫІ «РЭСТАЎРАЦЫЯ І КАНСЕРВАЦЫЯ ТВОРАЎ ДЭКАРАТЫЎНА-ПРЫКЛАДНОГА МАСТАЦТВА»

Вышэйшая мастацкая адукацыя ў рэспубліцы ажыццяўляецца па спецыялізацыі «дэкаратыўна-прыкладное мастацтва». Выпускнікі ВНУ атрымліваюць кваліфікацыю мастака з указаннем пэў-

нага віду дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца ва ўсіх звёнах навучальных устаноў – прафесійна-тэхнічных вучылішчах, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах. Аднак падрыхтоўку спецыялістаў па рэстаўрацыі і кансервацыі твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва да гэтага часу ні адна навучальная ўстанова Беларусі не ажыццяўляла. У межах былога СССР такіх спецыялістаў рыхтавалі ў Ленінградскім мастацкім вучылішчы імя В.А.Сярова, у Маскоўскім мастацкім вучылішчы «Памяці 1905 года», а таксама ва Усерасійскай акадэміі жывапісу, скульптуры і архітэктуры (Масква).

Аб'екты па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў Беларусі маюць сёння разгалінаваную сетку ў абласных, раённых гарадах і сельскай мясцовасці. На гэтых аб'ектах працуе вялікая колькасць спецыялістаў рознай кваліфікацыі – будаўнікі, рамонтнікі, навукоўцы, мастакі і інш. Але ж не хапае спецыялістаў з больш вузкай спецыялізаванай падрыхтоўкай у галіне рэстаўрацыі і кансервацыі прадметаў мастацтва. Патрэбнасць у такіх спецыялістах вялікая. Прычым патрэбнасць у падрыхтоўцы спецыялістаў па новай спецыялізацыі назіраецца на ўсіх узроўнях сістэмы бесперапыннай мастацкай адукацыі. Такіх спецыялістаў чакаюць дзесяткі аб'ектаў па адраджэнні культурнай спадчыны, абласныя і раённыя музеі.

Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры, на наш погляд, мае ўсе магчымасці для падрыхтоўкі спецыялістаў па спецыялізацыі «рэстаўрацыя і кансервацыя твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва». Падрыхтоўка іх можа ажыццяўляцца на базе вучэбных майстэрняў кафедры народных рамёстваў БДУ культуры і спецыялізаваных майстэрняў Камітэта па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў. Пры гэтым магчыма арыентацыя падрыхтоўкі на засваенне тэхналагічных працэсаў па рэстаўрацыі і кансервацыі ў такіх кірунках дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, як кераміка і ганчарства, ткацтва і адзенне, вырабы з саломкі, дрэва, скуры і іншых матэрыялаў. База для забеспячэння навучальнага працэсу



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

па ўказанай спецыялізацыі ў цэлым ва універсітэце адпавядае неабходным патрабаванням. Што тычыцца ганчарства і керамікі, то маецца магчымасць ажыццяўляць рэстаўрацыю старажытнай кафлі, дэкаратыўных элементаў аздаблення пакояў палацаў, інтэр'ераў музейных памяшканняў.

Вытворчую практыку студэнты могуць праходзіць як у рэстаўрацыйных майстэрнях Камітэта па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў, так і на канкрэтных аб'ектах гістарычных мясцін Беларусі. Дапамогу ў прыцягненні спецыялістаў да выкладання спецыяльных прадметаў зможа аказваць Камітэт па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў.

У працэсе навучання па шэрагу відаў твораў дэкаратыўна-прыкладнога характару студэнты, акрамя спецыяльных дысцыплін, якія фарміруюць прафесійныя ўменні і навыкі, вывучаюць дысцыпліны гісторыка-культуралагічнага цыкла, традыцыі сусветных школ мастацтва, эстэтыку, псіхалогію творчасці, камп'ютэрную графіку і інш. Адначасова можна ажыццяўляць падрыхтоўку прафесіяналаў-педагогаў па спецыяльнасці «методыка выкладання спецыяльных дысцыплін». З гэтай мэтай базавая падрыхтоўка спецыялістаў павінна ўключаць блок псіхолага-педагагічных вучэбных дысцыплін і педагагічную практыку.

Такім чынам, спецыялісты, якія атрымліваюць адукацыю ў галіне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, будуць падрыхтаванымі для творчай, педагагічнай, даследчай і арганізацыйна-кіраўніцкай дзейнасці. З увядзеннем спецыялізацыі па рэстаўрацыі і кансервацыі твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва будзе магчымасць на больш высокім узроўні ажыццяўляць узнаўленне жыццёвага цыкла адпаведных твораў.

Для ўдакладнення якасных і колькасных параметраў падрыхтоўкі спецыялістаў неабходныя пераасэнсаванне і дыдактычнае забеспячэнне зместу іх дзейнасці ў галіне рэстаўрацыі і кансервацыі мастацкіх твораў на аб'ектах культуры.

Выпускнікі, якія атрымаюць такую спецыяльнасць, могуць працаваць у творчых арганізацыях і аб'яднаннях, мастацка-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вытворчых і рэстаўрацыйных майстэрнях, а таксама ў праектных арганізацыях, галіновых лабараторыях.

Прафесійная дзейнасць у галіне рэстаўрацыі і кансервацыі твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва азначае не толькі авалоданнс ў працэсе навучання адпаведнымі ведамі і ўменнямі, але і развіццё здольнасцей, якія садзейнічаюць далучэнню да твораў мастацтва, і глыбокае пазнанне прыроды. Таму абітурыенты, што выбіраюць дадзеную спецыяльнасць, павінны прадэманстраваць валоданне пэўнымі ведамі і ўменнямі ў выяўленчым мастацтве, гэта дазволіць ім удзельнічаць ва ўступных конкурсных экзаменах.

Вяртанне да новага жыцця твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва – напружаная, доўгая, карпатлівая работа, якой папярэднічаюць сістэматызаванае вывучэнне і даследаванне прадметаў рэстаўрацыі з розных бакоў – гістарычнага, мастацкага, тэхналагічнага, функцыянальнага і інш. Служэнне рэстаўрацыйнаму мастацтву патрабуе ад спецыялістаў пастаяннай работы па ўдасканальванні прафесійнага майстэрства і поўнай самааддачы.

Будучыя спецыялісты ў галіне рэстаўрацыі і кансервацыі твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва павінны ўнесці свой уклад у гуманізацыю грамадства, павышэнне культурнага патэнцыялу нашага народа, развіццё мастацкіх здольнасцей і творчага пачатку кожнага чалавека.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**В.В.Шунейка,** *выкладчык*

## ТЭХНАЛАГІЧНЫЯ ПРЫЁМЫ АСОБАСНА АРЫЕНТАВАНАГА НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ НА НЕФІЛАЛАГІЧНЫХ ФАКУЛЬТЭТАХ

Узаемаадносіны паміж людзьмі ажыццяўляюцца з дапамогай вуснай і пісьмовай мовы. Каб стасункі былі больш зразумелыя і дасканалыя, трэба валодаць культурай маўлення – уменнем